Для аховы рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл была створана Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы ёй удаецца захаваць многія віды раслін і жывёл.

Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь — гэта сімвал адказных адносін да навакольнай прыроды, клопату пра будучыню планеты.




**Успомніце.** Ці даводзілася вам аказваць дапамогу свойскай або дзікай жывёле? Раскажыце, як гэта было. Якія пачуцці вы перажывалі ў гэты час?

**Акрыя́ць** — папраўіцца пасля хваробы, ачуняць; набрацца сіл, акрэпнуць.
**Заху́таць** — шчыльна абхінуць, укрыць чым-небудзь.
**Лоўж** — куча сухога галля.
**Знямо́га** — стан крайняй стомленасці, бяссілля.



## Выратаванне вожыка

*Генадзь Пашкоў*

Як неслі вечарам грыбоў,
а іх — пад ручкі ў кошыках! —
ля трох разгалістых дубоў
убачылі мы вожыка.

Упаў у я́му ля лаўжа́
і, выбрацца не змогшы,

на дне прыцішаны ляжаў,
да голачкі прамокшы.

Малы — змясціла даланя́!
І нездарма знямога
ў яме той на схіле дня
зваліла з ног малога.

Наташа мокрага яго
заху́тала ў хусцінку,
і сябра новага свайго
нясе дамоў дзяўчынка.



Каб ачуняў малы, яна
паху́квае ў далоні.
Вунь хмару на зыходзе дня
калючы вецер гоніць.

Ударыць лівень па плячах
ці навальніца хай бы! —
не згаснуць знічкі ў вачах
любві, спагады, жа́льбы.

Хутчэй дадому, у цяпло.
А ў хаце, каля печы,
няхай духмяным малаком
сагрэецца малеча.

Як акрыя́е вожык той,
Хоць і шкада, урэшце, —
калючага прыйдзе́цца ёй
да трох дубоў аднесці!..



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

1. Калі і дзе знайшлі дзеці вожыка?
2. Чаму Наташа вымушана была забраць яго дамоў? Ці правільна яна зрабіла? Дакажыце сваю думку.
3. Якімі якасцямі характару вызначаецца дзяўчынка? Патлумачце. Пры неабходнасці скарыстайце памятку на форзацы 1.
4. Як вы разумееце сэнс радкоў: «...не згаснуць znічкі ў вачах любві, спагады, жальбы»?
5. Чаму аўтар гаворыць, што вожыка прыйдзецца аднесці назад у лес? Аргументуйце.
6. Вызначце тэму і асноўную думку твора.
7. Да якога эпізоду зроблена ілюстрацыя? Знайдзіце і прачытайце радкі, якія праілюстраваны.
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора.

**Рэспубліканская акцыя «Сад надзеі» актыўна крочыць па ўсёй Беларусі. Юныя беларусы з задавальненнем далучаюцца да азелянення прышкольных тэрыторый. Лепшы падарунак нашчадкам — квітнеючая Радзіма.**

**Под** — гарызантальная паверхня ўнутры печы, на якую кладзецца паліва.
**Прага́л** — мясціна, палянка ў лесе, свабодная ад таго, што знаходзіцца вакол яе.
**Пры́кры** — які выклікае пачуццё незадавальнення, крыўдны.
**Сядзіба** — асобны дом з усімі прыбудовамі і зямельным участкам.
**Хрушч** — майскі жук.
**Адме́тны** — не падобны да іншых, непаўторны, характэрны.